**Л. Я. Глазман**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава
e-mail: lubov_glazman@bk.ru

УДК 821.161.3.09(092)+821.161.09(092)

# ІЛЮЗІЯ І РЭАЛЬНАСЦЬ У "МАЛОЙ" ПРОЗЕ Л. АНДРЭЕВА І М. ГАРЭЦКАГА

*Ключавыя словы*: *ілюзія, рэальнасць, светапогляд, "патаемнае", нацыянальна-культурная спецыфіка.*

*У артыкуле даследуецца праблема суіснавання ў свядомасці чалавека ілюзорнага і рэальнага, асэнсаваная Л. Андрэевым і М. Гарэцкім у кантэксце філасофскіх праблем першых дзесяцігоддзяў XX стагоддзя ва ўмовах суіснавання рэалістычных і мадэрнісцкіх культурна-літаратурных тэндэнцый. Канкрэтызуецца ўяўленне пра дамінанты мастацкага свету даследуемых пісьменнікаў.*

Л. Андрэеў і М. Гарэцкі ў сваіх творах актыўна звяртаюцца да тэмы знаходжання чалавека паміж відавочным, рацыянальна абгрунтаваным, лагічным і звышнатуральным, хаатычным бокам быцця. Пры гэтым і рускім, і беларускім аўтарам робіцца спроба пераасэнсавання месца і ролі чалавека ў свеце, знешняя ўпарадкаванасць якога аказваецца такой уяўнай і так лёгка разбураецца.

У прозе Андрэева з падобнай праблематыкай канфлікт чалавека са светабудовай і агульнапрынятымі нормамі часам выліваецца ў своеасаблівы бунт героя, які часта мяжуе з багаборніцтвам (*"Маўчанне"* (1900), аповесць *"Жыццё Васіля Фівейскага"* (1903), *"Вясновыя абяцанні"* (1903), *"Сын чалавечы"* (1909)). У апошнім з іх паказаны крызіс ідэнтычнасці героя ва ўмовах рэлятывізму каштоўнасцяў, якія церпяць метамарфозы, на вачах папа Івана Багаяўленскага пераўтвараючыся ў пустыя формулы, аб'екты для маніпуляцый. Бунт айца Івана з'яўляецца вынікам своеасаблівага пратэсту супраць маралі, якую можна свабодна скарыстаць у сваіх інтарэсах, што поп і паспяшаўся прадэманстраваць на ўласным прыкладзе ўсяму святарскаму асяроддзю. Парадыйнасць, гратэскавасць апавядання толькі ўзмацняе яго экспрэсіўнасць і драматычнасць сітуацыі, якая перарастае ў сур'ёзны асобасны пошук: адмаўленне ад прозвішча як ад неадпаведнага "знаку" выліваецца ў шукальніцтва нейкага вышэйшага знаку.

Падобную накіраванасць па сюжэце мае апавяданне Гарэцкага *"Дурны настаўнік"*, галоўны герой якога таксама паўстае супраць усталяванай светабудовы. Калісьці паважаны чалавек, настаўнік Кубраковіч страчвае ўласную ідэнтычнасць, становячыся звар'яцелым жабраком, мясцовым блазнам. Істотную ролю, як і ў андрэеўскім творы, у вар'яцтве настаўніка адыгрывае "добранамеранае грамадства". Але, па-сутнасці, галоўны герой расплачваецца за свае замахі на "патаемнае". Злыя языкі і кансерватызм сялян у стаўленні да ўласных прымхаў і забабонаў робяць людзей чэрствымі ў стаўленні да залішне рызыкоўнага настаўніка, якому не даруюць ягоных правакацыйных выпадаў супраць агульнапрынятага. Але чытач бачыць і рацыю сялян: Якубу Цімохавічу не даруюць знявагі, выяўленай да веры продкаў, пачынаюць ставіцца да чалавека, якога раней лічылі за разумнага, разважлівага, як да вар'ята, і праз тое ўрэшце набываюць у яго асобе сапраўднага гарадскога юродзівага. Такім чынам, супрацьстаянне адбываецца не па лініі "непісьменнасць, неадукаванасць" – "пісьменнасць, адукаванасць", а хутчэй у плане "сацыялізаванасць, чалавечая сталасць – нясталасць, безразважнасць, авантурнасць". Сялянскі розум у рэальным жыцці супрацьстаіць "дурноце" настаўніка.

У эпоху мадэрнісцкага пераасэнсавання рэчаіснасці Максіма Гарэцкага надзвычай цікавіць сувязь рацыянальнага і неспасціжнага, "патаемнага" боку існавання – пачынаючы з ранніх апавяданняў і на працягу ўсяго творчага жыцця. Аднак адлюстроўваючы і таямніцы свету, і таямніцы чалавечай душы (што пазней акцэнтуецца ў яго творчасці ў феномене "дваістасці" характару), Гарэцкі ўвесь час прапускае агульначалавечыя каштоўнасці праз нацыянальнае ўспрыманне. Гэтую скіраванасць акадэмік В. Каваленка слушна называе "тенденцией поднять национальное до уровня общечеловеческого" [2, с. 118]. Такой тэндэнцыяй і абумоўлены "надрывно-мучительные мотивы" [2, с.118] у творчасці пісьменніка, што і дазваляе некаторым даследчыкам параўноўваць творы Гарэцкага з мадэрнісцкімі, у тым ліку з андрэеўскімі [5, с. 100-101].

У апавяданнях Гарэцкага быццё чалавека ў свеце асэнсоўваецца, між іншым, як пошук пэўнага балансу паміж разумным, навуковым падыходам да жыцця і неспасціжным, інтуітыўным, які падчас уяўляе сабой забабоны "цёмнага", неадукаванага народа (*"У лазні"*, *"Роднае карэнне"*, пазнейшы твор *"Стары прафесар"* (1921)). На думку пісьменніка, якімі б дзіўнымі і часам прымітыўнымі ні здаваліся адукаванаму чалавеку народныя ўяўленні, яны з'яўляюцца тым неабходным складнікам, без разумення якога немагчыма адэкватная самаідэнтыфікацыя беларускага народа, у прыватнасці інтэлігенцыі; тым "родным карэннем" [4, с. 73], адэкватная повязь з якім дапаможа адрадзіць нацыю.

Репозиторий ВГУ

У супастаўленні “малой” прозы Андрэева і Гарэцкага варта таксама звярнуць увагу на апавяданні з выразнымі філасофскімі матывамі, сярод якіх *“Цёмны лес”* (1913), *“Патаёмнае”* (1913), *“Што яно?”* (1913) М. Гарэцкага, *“У цягніку”* (1900), *“Уваскрэсенне ўсіх мёртвых”* (1914) Л. Андрэева. Іх адметнасць – у асаблівым спалучэнні філасофскай думкі і эмацыянальна-лірычнага ўздзеяння на чытача, якое дае падставы гаварыць пра імпрэсіяністычную накіраванасць апавяданняў. Пра гэта сведчыць жаданне абодвух аўтараў уздзейнічаць не столькі на чытацкі розум, колькі на ўражанне, эмоцыі, нешта падсвядомае, што дасягаецца прыёмамі відавочнай урыўкавасці, лірызму, хаатычнасці падзей, выразнымі матывамі трывогі, страху смерці, прысутнасці нячыстай сілы. Сам аб’ект увагі, даволі спецыфічны, патрабаваў адэкватнай формы выражэння. Бо такім глабальным, філасофскім разважанням пра сэнс жыцця, нябачную і неспасціжную наяўнасць звышнатуральнага, немінучасць смерці нельга даць рацыянальнага тлумачэння, іх можна толькі ўлавіць, адчуць. У апавяданнях такога тыпу Гарэцкі свядома сцірае межы паміж рэальным і ўяўным. Так, у апавяданні *“Што яно?”* іх практычна нельга вылучыць нават фармальна з шэрагу цесна пераплеценых падзей, якія нібыта адбываюцца то насамрэч, то ў свядомасці чараўніка Янкі, а то і ў думках самога наратара.

Фантасмагарычныя разважанні пісьменнікаў пра жыццё і смерць, мінулае і сучаснасць адбіліся ў апавяданнях *“Руіны”* (1921), *“Пакінутыя хаты”* (1921). Гарэцкі ў іх з дапамогай сну звяртаецца да мінулага, перад вачамі апавядальніка то ажывае цэлая шляхецкая эпоха, то ўзнікае “старасвеччына”, якой нібыта цікавіцца герой: вялізны пакой, “поўны чалавечых касцей, чарапоў і яшчэ недагнілых трупаў” [4, с. 280] – водгаласы мінулай вайны. Часавы вектар апавяданняў *“Цудоўна жыццё для ўваскрошаных”* (1900), *“Уваскрэсенне ўсіх мёртвых”* Л. Андрэева з падобнай тэматыкай – напісаных, дарэчы, напярэдадні тых падзей, якія водгаласамі гучаць у *“Пакінутых хатах”* Гарэцкага – накіраваны ў процілеглы бок. Яны прасякнуты прадчуваннямі героем надыходзячых змен. І наколькі радасныя чаканні нейкага абнаўлення, прыбліжанага нават да рэлігійнага, у Андрэева, настолькі ж цяжкім успамінам яно суправаджаецца ў сведкі ваеннай трагедыі – беларускага аўтара.

Абодва пісьменнікі добра адчуваюць тую ілюзорнасць жыцця, якая прымушае мерыць адны і тыя ж здарэнні рознымі меркамі, на працягу гадоў то надаючы ім асаблівую значнасць, то бязлітасна адсяваючы ў разрад “драбніц”. Самі героі на ўласным вопыце перажываюць гэтую адноснасць, залішнюю суб’ектыўнасць успрымання падзей: “Я ж успрымаю так, як на тое паказала маё ўзгадаванне, мой светагляд, мае пачуцці…” [4, с. 265], “Глаза обманывают” [1], “…говорили мы и о жизни, о ее красоте и богатстве, о глубинах ее бездонных, над которыми беззаботно и слепо плавают люди-щепки” [1].

Матыў ілюзіі, самападмана гучыць таксама ў андрэеўскім апавяданні “*Прывіды”* (1904). Дзеянне разгортваецца ў доме для вар’ятаў, але аўтар па-ўсялякаму падкрэслівае звычайнасць яго жыцця, падабенства з нармальным, уключаючы ў гульню ілюзіі нароўні з прывіднасцю светаўспрымання персанажаў і чытацкую свядомасць. У кожнага з персанажаў лякарні свая жыццёвая ўстаноўка, свае ілюзіі. Адзін з герояў стала ідэнтыфікуе сябе з Георгіем-Пераможцам, што рэгламентуе ўсё яго жыццё: бачачы сябе апорай і надзеяй грамадства, ён усё робіць з аднолькавым імпэтам і задавальненнем. Другі, наадварот, паўсюль бачыць ворагаў. Трэці знайшоў уласны спосаб выжывання: увесь час грукае ў зачыненыя дзверы. (Дарэчы, андрэеўскі матыў блукання, зачыненых дзвярэй і калідораў рэалізуецца і ў іншых яго творах: *“Сцяна”* (1901), *“Праклён звера*” (1908), *“Зварот”* (1913)). Доктар установы стварае вакол сябе ілюзію руху жыцця, ратуючыся штодзённа ў рэстараннай мітусні. Фельчарыца мяняе погляд на свет у залежнасці ад колеру шкла, праз якое глядзіць. Знаёмства з героямі стварае сітуацыю падробленасці і надуманасці, нечага фальшывага. Акрамя таго, аўтар указвае на раз’яднанасць персанажаў, кожны з якіх “слишком сильно увлечен своей идеей, чтобы слушать или слышать кого бы то ни было” [2, с. 144]. Аднак, разам з тым, пісьменнік імкнуўся паказаць станоўчыя моманты ў разнастайнасці падыходаў да жыцця, меркаванняў. Бо ніхто не ведае, як правільна жыць, кожны выбірае нешта для сябе. Магчыма, менавіта гэта Андрэеў меў на ўвазе, калі беспаспяхова пераконваў сяброў у аптымістычнасці твора.

Матыў прывіднасці, ілюзіі выразна адлюстраваны таксама ў познім андрэеўскім творы “*Зварот”*, герой якога апынаецца ў Маскве, нібыта па партыйных справах, і вымушаны блукаць па невядомых, варожых мясцінах. У выніку размываецца ўяўленне пра тое, хто ён, дзе і дзеля чаго знаходзіцца, пакуль не трапляе да незнаёмага дома. Пасля настойлівага і трывожнага (бо ў доме быццам бы знаходзіцца яго нявеста) грукання ў дзверы герой трапляе ў сваю турэмную камеру, якую, зноў жа, быццам і не пакідаў. Так, эпізод, напісаны ў імпрэсіяністычнай манеры гнятлівага страху і трывогі, выводзіць простую калізію (“штосьці прымроілася”) на агульнафіласофскія разважанні: “хто я?” і “што я раблю?” У дадзеным выпадку, герой – чалавек, які грукае ў дзверы ўласнай камеры. Невыпадковымі з’яўляюцца таксама думкі пра здраду, якія прыходзяць у галаву

Рэпазіторый ВДУ

героя наконт зніклай нявесты ў апошні момант, паколькі гэтая дэталь аказваецца адным з варыянтаў, чаму герой зняволены, і зближае два планы: фантастычны і рэалістычны.

Адноснасць чалавечых спраў, пераацэнка іх па значнасці ў пераламленні жыццёвых дробязяў і няспынным колазвароце гісторыі паказана Гарэцкім у апавяданні "*Габрыелевы прысады*". Тое, што здаецца надзвычай важным у адзін момант жыцця, праз некалькі гадоў адыходзіць у нябыт (п'янства, грахі Габрыеля). І наадварот, вонкава непатрэбнае, пустое – прага героя да насаджэння дрэў, якую не разумелі людзі – з часам набывае найвышэйшы сэнс, становіцца "прысадамі жыцця" праз гады для апавядальніка [4, с. 215]. Але і прысадам, паводле законаў лёсу, надыдзе час саступіць месца для нечага іншага. Пісьменніку ўдалося добра адлюстраваць гэтую парадаксальнасць рэчаіснасці і адноснасць чалавечых меркаванняў і ўражанняў.

Атрымліваецца, што нейкія звышнатуральныя праявы жыцця могуць паўплываць на лёс чалавека, унесці ў яго душу новыя перажыванні, узбагаціць яе, падштурхнуць да добрых спраў. У творы сцвярджаецца неспасціжная і вечная каштоўнасць жыцця, якое складваецца і з "каравага, чорнага і аграмаднага" [4, с. 213], і з "гарманічнага, музыкальнага і харошага" [4, с. 213], якія адчуліся малому хвораму Габрусіку і засталіся ў яго душы, падштурхнулі насаджаць дрэвы, лёс кожнага з якіх, як і чалавечае жыццё, непрадказальны, але па-свойму каштоўны. Тое, што здарылася з героем, немагчыма лагічна патлумачыць, але, напэўна, адчуванне цудоўнай таямніцы, успрыманне жыцця як цуду і спарадзіла ў Габрыеля звычку няспынна садзіць дрэвы. Аднак як непрадсказальны лёс дрэва, так і чалавечае жыццё можа па-рознаму павярнуцца. Для Габрыеля прысады з цягам часу згубілі свой "патаемны" сэнс. Нездарма герой-апавядальнік паказвае яго як вялікага "грэшніка, баламута, п'яніцу, картэўніка, гуляку" [4, с. 212]. А ўвогуле ў структуры апавядання даволі празрыста чытаюцца элементы жыційнага жанру, толькі акрамя цуду ўсе падзеі падаюцца з адваротным, негатыўным сэнсам. Але таму жыццё і таямнічая з'ява, што шляхі яго нязведаны. І ўжо не Габрыель у цэнтры ўвагі апавядальніка, а яго ўласны лёс, які невядома, куды завядзе. Асноўную думку апавядання мы бачым у тым, што ў непрадказальнасці жыццёвых дарог, у іх недасканаласці, якая складаецца адначасова і з гарманічнага, і з "каравага", калечанага, а таксама ў рэдкіх перамогах светлага боку жыцця над цёмным і заключаецца жыццёвае харaство і прыцягальнасць.

Калі пазначаць адрозныя, спецыфічныя для творчасці кожнага з прадстаўленых аўтараў рысы, навідавоку аказваецца ўплыў на творчасць Л. Андрэева і М. Гарэцкага нацыянальных культурна-літаратурных традыцый. Асобасны канфлікт герояў прааналізаваных апавяданняў Гарэцкага цесна звязаны з забабонамі, або тэмай небяспечных ведаў. У творах Андрэева адчуваецца ўплыў рускай класічнай культурна-літаратурнай традыцыі. Асабліва востра – у калядных і пасхальных творах, дзе падаецца перралом у самаідэнтыфікацыі персанажа пад уплывам свята, матыў своеасаблівага ачышчэння, у выніку якога светлае, добрае перамагае цёмныя бакі свядомасці героя (або – па-андрэеўскі – наадварот).

Л. Андрэеў малюе героя, які шукае сапраўднае праз адмаўленне чалавечага вопыту, пратэстуючы супраць яго прагнілых прынцыпаў і дагматаў; героя, які спрабуе "дакрычацца" да безуважных нябёсаў і чэрствых душ людзей. Гэта надае апавяданням, у якіх пісьменнік імкнецца паўплываць на свядомасць і ўзварухнуць пачуцці чытача, асаблівую надрыўнасць і экспрэсіўнасць. Герой М. Гарэцкага таксама знаходзіцца ў пошуку, але гэты пошук не адмаўляе здабыткаў чалавецтва, а, наадварот, спрабуе выйсці да сапраўднай, "не фальшывай праўды" [4, с. 233], захоўваючы народжаныя беларускім народам ідэалы.

Светапогляд асобы ў творах Л. Андрэева і М. Гарэцкага прадвызначаецца супярэчлівасцю і ілюзорнасцю свету, у якім нельга ўсё рацыянальна патлумачыць. Калі ў рускага аўтара ілюзорнаць мае глабальны, агульначалавечы сэнс, то ў творах Гарэцкага ілюзія стварaецца яшчэ і за кошт нацыянальнага ўспрыняцця: чалавек – носьбіт таямніц свайго народа. Ва ўяўленні Андрэева чалавек часцей аказваецца прыгнечаны нейкімі вышэйшымі сіламі, якія фактычна чыняць над ім самаўпраўнасць. У творах Гарэцкага – больш канкрэтызаваны прасторава-часавы кантэкст. На асобу аказваюць уплыў не нейкія абстрагаваныя сілы, а канкрэтныя сацыяльна-палітычныя падзеі, якія адбываюцца на тэрыторыі краіны і робяць з людзей ахвяр – маральных і фізічных.

**Літаратура**


1. Андреев, Л. Н. В поезде / Л. Н. Андреев // Lib.Ru: Классика [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://az.lib.ru/a/andreew_l_n/text_0132.shtml. – Дата доступа: 09.02.2014.
2. Андреев, Л. Н. Собрание сочинений : в 6 т. / Л. Н. Андреев. – М. : Худож. лит., 1990 – 1996. – Т. 2. : Рассказы; пьесы. 1904 – 1907. – 1990. – 559 с.
3. Коваленко, В. Трагическая мечта о буйном колошении… Философия национальной жизни в творчестве М. Горецкого / В. Коваленко. // Неман. – 1995. – № 3. – С. 115 – 129.
4. Гарэцкі, М. І. Збор твораў : у 4 т. / М. І. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1984 – 1986. – Т.1.: Апавяданні 1913 – 1930. – 1984. – 446 с.
5. Мішчанчук, М. Вобразная сістэма прозы Максіма Гарэцкага ў кантэксце пошукаў мадэрнісцкай літаратуры першай палавіны ХХ стагоддзя / М. Мішчанчук // Максім і Гаўрыла Гарэцкія і спадарожніцы іх жыцця і творчай дзейнасці. Матэрыялы XIV Гарэцкіх чытанняў (прысвячаюцца Году Маці). Мінск, 8 чэрвеня 2006 г. / Калектыў аўтараў; рэдкал.: Р. Гарэцкі (адказны рэд.) [і інш.]. – Мінск : 2007. – С. 100-106.




Репозиторий ВГУ

**L. Y. Hlazman**
Vitebsk State University
e-mail: lubov_glazman@bk.ru

**Ilusion and Reality in L. Andreyev's and M. Haretsky's short stories**

*Keywords: illusion, reality, world view, mysterious, national and cultural specificity.*

*The article deals with the problem of coexistence in the human mind of illusory and rational constituents. It was represented by L. Andreyev and M. Haretsky in the context of the philosophical problems in the first decades of the 20th century in the coexistence of realistic and modernistic cultural and literary trends. The article focuses the dominating ideas in writers' oeuvre*

**А.Г.Желамский**
Музей пейзажного наследия «Окоём»
(д. Чернецово Невельского района Псковской области)
e-mail: praga550@mail.ru

УДК 821. 161

## О ПОЭТИЧЕСКОМ (НЕНАУЧНОМ?) ОТКРЫТИИ МИРА

*Ключевые слова: научное знание, прогресс, мировосприятие, русская поэзия, пейзажные образы, «поэтическое слушание» природы.*

*Научно-технический прогресс, нацеленный на преобразование и покорение природы, высветил необходимость выстраивания новой – не природно-ресурсной, а духовной концепции «известных» географических пространств и земных пейзажей. На этом пути нам предстоит заново освоить «опыт» русской и всей славянской поэзии, наиболее полно выразившей отношение к миру, в котором живём.*

Возникновение и развитие науки диктовалось вечным и загадочным стремлением человека к познанию окружающего мира. Многие века, а, скорее – тысячелетия существования человеческого рода прошли под знаком созерцательных наблюдений над стихиями природы. Этот период длительного «простодушного» восприятия мира в новое время (в 15–16 веках) неожиданным образом сменился идеологией покорения природы. Произошло, выражаясь словами П.Т.де Шардена, какое-то «невероятное потрясение сфер жизни» [1]. Местом рождения такой идеологии стала западная, европейская цивилизация, охватившая всё человечество.

В эпоху Возрождения (14–16 века) Европа преодолела средневековую идею божественного предопределения и объявила человека «венцом творения», у которого есть и права, и способности устроить этот мир по своему разумному плану. К тому времени завершилась эпоха великих географических открытий и Европа решила управлять этим миром и его природой – через развитие науки и техники. Ф.Бэкон провозгласил формулу – «Знание – сила». Эпоха стремительного развития науки и техники в 18-м – 20-м веках названа временем научно-технической революции.

Однако, к концу двадцатого века наметилось проявление каких-то новых «потрясений сфер жизни». На фоне победоносного шествия прогресса появились кризисные явления в мировом развитии – угроза исчерпания природных ресурсов и экологические проблемы. В сфере мировоззрения на смену модерну с его опорой на рациональное знание и законы логики пришёл постмодерн, который отказывается от традиций, диктата разума и поиска смыслов. При этом в постмодерне есть одно положительное качество: он высветил, что в отношении к миру важно не только рацио (знание), но и переживание (восприятие) этого мира. Стало очевидным, что есть смыслы, неподвластные логике. Они зависят от нашего восприятия этого мира. Тенцинг Норгей – первый (вместе с Э.Хиллари) покоритель Эвереста – на вопрос об этой вершине мира ответил «…что такое Эверест без глаза, который его видит ? Велик ли он или мал – это зависит от души человека.» [2, с.271].

В основе научного познания всегда была и есть логика, но В.И.Вернадский заметил, что истина открывается не через логику, а через жизнь : «Познать научную истину нельзя логикой – можно лишь жизнью. Действие – характерная черта научной мысли» [3, с.39].

Новое отношение к миру пробивается к нам не только из искусства, поэзии, но и из самой науки. И. Пригожин (известный европейский учёный русского происхождения, Лауреат Нобелевской премии) вместе со своей коллегой И.Стенгерс признают, что в нынешнее время проходит гипноз сугубо научных представлений, что теперь мы более чем прежде «должны уважать и любой другой интеллектуальный образ мира… Наш мир – это не молчаливый и однообразный мир часового механизма… Научное знание, возникшее как бы во вдохновенном сне,…может нынче оказаться в то же время «поэтическим слушанием» природы…» [4, с.86 – 95].

Репозиторий ВГУ